*Вера Пракапцова*

# БАРБАРА РАДЗІВІЛ: ГІСТОРЫЯ, ЛЕГЕНДА, МАСТАЦКІ ВОБРАЗ

Асоба Барбары Радзівіл, яе каханне і шлюб з каралём Сігізмундам Аўгустам далі падставу для разнастайных меркаванняў, гісторый і паданняў, якія складваліся на працягу чатырох стагоддзяў. Адлюстраванне асобы Барбары і ў гістарыяграфіі, і ў публіцыстыцы, і ў мастацтве мянялася ў залежнасці ад развіцця народнай свядомасці і ад іерархіі каштоўнасцей, якія былі пакладзены ў аснову той ці іншай сацыякультурнай эпохі. Меркаванне аб тым, што вобраз Барбары Радзівіл уплываў на пачуцці і думкі спадчынных пакаленняў, з'яўляўся сімвалам прыгажосці і зямнога кахання, склалася намнога пазней.

XVI стагоддзе, у якім адбываліся падзеі, звязаныя з Барбарай Радзівіл, адно з самых яскравых у гісторыі сусветнай культуры. Адна з асноўных праблем філасофіі і мастацтва таго часу была звязана з пытаннямі становішча чалавека ў свеце, яго каштоўнаснымі якасцямі. Антрапацэнтрызм мыслення эпохі Адраджэння вызначаў адраснасць пошукаў і ў галіне навукі, і ў галіне мастацтва.

Жыццё Барбары Радзівіл стала цудадзейным прыкладам жыцця адукаванай, эмансіпіраванай дамы, якая бліскуча ўвайшла ў свецкае асяроддзе. Вядомы дзве навацыі, якія Барбара ўвяла пры кракаўскім двары. Яна дабілася дазволу падчас службы ў касцёле дамам з акружэння каралевы і дваранам караля стаяць разам, а не паасобку, як было раней. Таксама яна ўнесла змены ў прыдворны этыкет, які раней узвышаў мужчын над жанчынамі. Каранаваная Барбара ўвяла звычай, калі кароль і яго акружэнне павінны былі чакаць каралеву, пакуль тая не будзе гатовая да выхаду.

Самая прыгожая жанчына дзвюх дзяржаў — Польшчы і Вялікага княства Літоўскага змагла пакарыць сэрца высакароднага мужчыны. Гісторыкі апісваюць яе як яскравую прадстаўніцу ўсходнеславянскага Рэнесанса.

Барбара Радзівіл была высокай для свайго часу жанчынай (160 см), вельмі рухомай, з правільнымі прапорцыямі цела і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вельмі прывабнай знешнасцю. Яе параўноўвалі з класічнымі прыгажунямі. Абаяльную, смуглую бландзінку ўпрыгожвала і незвычайная элегантнасць. Зыходзячы з моды свайго часу, Барбара красавалася ў пазалочанай вопратцы і каштоўных камянях. Любімым упрыгожаннем маладой жанчыны былі жамчужныя каралі. Менавіта ва ўпрыгожаннях з жэмчугу яна пазіравала мастакам. Усіх, хто сустракаўся з прыгажуняй, зачароўвала ласкавая мова, свабода і веліч, якія прысутнічалі ў яе рухах.

Зыходзячы з апісанняў польскага даследчыка Збігнева Куховіча, можна сцвярджаць, што Барбара Радзівіл нарадзілася 6 снежня паміж 1520 — 1523 гадамі. Калі прыняць за найбольш дакладную апошнюю лічбу, дык у гэтым годзе можна адзначаць 480-годдзе з дня яе нараджэння. Яе бацька — Юрый Радзівіл выхоўваў дачку ў строгасці, але была яшчэ сястра Ганна і два браты — Мікалай Радзівіл Рыжы і Мікалай Радзівіл Чорны.

Паспрабуем звярнуцца да праблемы кахання на троне (аналогія з праблемай сумлення на троне), якую даследаваў у сваіх творах вялікі драматург англійскага Адраджэння Вільям Шэкспір.

Знаёмства Барбары Радзівіл і маладога князя Сігізмунда Аўгуста адбылося ў 1543 годзе. У першых сваіх шлюбах і Барбара, і Сігізмунд не былі шчаслівымі. Відаць, менавіта таму раман пачаўся з першага знаёмства. Каханне было шчырым, глыбокім і сур'ёзным. Згодна легендзе, князь аднойчы прывёз з Захаду яшчэ невядомых у Рэчы Паспалітай лебядзей. Іх змясцілі каля рэчкі Віліі спецыяльна для любай Барбары. Хронікі сцвярджаюць, што Сігізмунд Аўгуст загадаў пабудаваць пераход ад каралеўскага замка ў Вільні да Радзівілаўскага, які знаходзіўся побач.

У іх было шмат агульнага: яны захапляліся паляваннем, каштоўнасцямі, цікавіліся палітыкай, справамі дзяржавы і дынастычнамі клопатамі сваіх сямей. Яны абодва былі высокаадукаванымі людзьмі, атрымалі еўрапейскую адукацыю. Іх навучалі музыцы, танцам, жывапісу, верхавой яздзе, старажытным (латынь) і сучасным (італьянская, нямецкая) мовам, і правільным паводзінам у грамадстве. Барбара хутка пісала і валодала прыгожым почыркам.

Яны былі роўныя амаль ва ўсім, роўныя ў каханні. Адно, што іх выводзіла за межы роўнасці — гэта трон.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сігізмунд Аўгуст быў апошнім з роду Ягелонаў, сынам караля Польшчы. Маці — Бона Сфорца, італьянка па паходжанні, вельмі прагматычная і строгая дама, якая мела вялікія сувязі ў дзяржаўных колах, магла ўплываць не толькі на сямейныя ўзаемаадносіны, але і на дзяржаўныя законы, якія выдаваліся каралём, але абмяжоўваліся Радай. Рада мела дзяржаўны статус і юрыдычна магла абмяжоўваць дзейнасць караля. Пытанні шлюбу караля таксама вырашаліся са згоды Рады.

Барбара шчыра кахала Сігізмунда і не лічыла галоўнай мэтай выйсці за яго замуж, але бліжэйшыя яе родзічы марылі пра забеспячэнне Барбары каронай. Яе браты патрабавалі, каб вялікі князь ці то ажаніўся, ці то не наведваў болей іх сястру.

Тайны шлюб, якім былі аб'яднаны закаханыя, адбыўся, згодна хронікам, паміж 24 ліпеня і 5 жніўня 1547 г. Імкненне да легалізацыі тайнай жаніцьбы характарызавала Сігізмунда, па словах Збігнева Куховіча, як вельмі эгаістычнага чалавека, які не хацеў падпарадкоўваць свае пачуцці абавязкам чалавека высокага дзяржаўнага рангу. Але маці — Бона Сфорца — не патыкала яго пачуццям і жорстка стаяла на пазіцыі «не пушчаць літвінку на польскі прастол».

Пасля смерці бацькі Сігізмунд Аўгуст атрымаў усе паўнамоцтвы караля і паведаміў Радзе пра свой шлюб, запрасіўшы ў залу пры гэтым і Барбару. Адной з прычын таго, што Рада прыняла гэтае абвяшчэнне без асобага энтузіязму, але і без пратэсту, была зайздрасць іншых магнатаў да ўзвышэння роду Радзівілаў, якія не былі дынастычнага паходжання. Хаця тут трэба адзначыць, што бацька Барбары — Юрый Радзівіл быў вядомым палкаводцам, яго называлі Геркулесам Літоўскім за тое, што ён атрымаў трыццаць перамог над ворагам.

Каранацыя адбылася 7 снежня 1550 г., хаця не раз адкладвалася па прычыне фізічных недамаганняў Барбары. Сутнасць хваробы да сённяшняга дня дакладна не вядома. Даследчыкі адзначаюць тры версіі. Згодна першай — венерычнае захворванне, згодна другой — атручэнне лекамі ад бясплоднасці, па трэцяй версіі выяўляецца, як зараз устаноўлена, захворванне ракам. Але існуе і дагэтуль не абвергнута і чацвёртая версія — нібыта Барбара была атручана Бонай. Нават да нашых дзён у народных паданнях захавалася імя аптэкара — Монці, які зрабіў смяротны яд Барбары.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што б ні было прычынай яе смерці, але памёрла яна ў вялікіх пакутах 8 мая 1551 г. Пахавана была ў касцёле Святога Станіслава ў Вільні, дзе і нарадзілася. Як распавядае легенда, Сігізмунд увесь шлях ад Кракава да Вільні ішоў пешшу за трунной каханай.

Гора Сігізмунда было бязмерным і несуцешным. Малады кароль вырашае пры дапамозе алхімікаў выклікаць дух Барбары Радзівіл. Каб дапамагчы Сігізмунду Аўгусту выклікаць дух сваёй закаханай, былі запрошаны Мнішак і Твардоўскі. Невядома, ці існаваў ў рэальным жыцці Мнішак. Аднак згодна гісторыі асоба Твардоўскага ўстаноўлена. Па сцвярджэнням у даследаванні З. Куховіча ўстаноўлена, што ў бібліятэцы Ягелонаў у Кракаве знаходзяцца кнігі, якія належылі Твардоўскаму. На іх знойдзены адбітак рукі д'ябла. Гаварылі, што чарнакніжнік прадаў душу д'яблу, каб той забраў яе пасля смерці, калі Твардоўскі будзе ў горадзе Рыме. Смерць алхіміка наступіла ў карчме пад назвай «Рым».

Легенда пра Барбару Радзівіл апавядае, як Мнішак і Твардоўскі рыхтаваліся да сустрэчы Сігізмунда са сваёй каханай. У паўцёмным пакоі былі размешчаны люстэркі. На адным з іх у поўны рост чалавека была выгравіравана фігура самой Барбары. На выяве яна была апранута ў любімае каралём белае адзенне. Калі выява на люстэрку заварушылася, кароль усхваляваўся. Як і Арфей, які спусціўся ў царства Аіда і не змог устрымацца ад таго, каб не азірнуцца на каханую Эўрыдыку, так і Сігізмунд не змог устрымацца ад таго, каб не кінуцца да прывіду са словамі «Басенька мая!». Ён дакрануўся да яе і здань Барбары знікла. Душа яе ўжо не магла знайсці прыстанку і з тых часоў яе чакала адвечнае блуканне па зямлі.

Вобраз Барбары Радзівіл жыве ў памяці народнай, легенды множацца, трансфармуюцца, у некаторых з іх яна паўстае як жорсткая і хітрая жанчына. Але больш прываблівае і чаруе рамантыка неўміручага кахання. Барабара засталася ў гісторыі нашай зямлі як першая жанчына з роду Радзівілаў, якая была каранавана. Можа, менавіта таму народныя паданні «перасялілі Чорную даму ў Нясвіж — горад, які стаў сімвалам магутнасці роду Радзівілаў, хаця гістарычныя хронікі сведчаць, што Барбара ніколі не бывала ў гэтых мясцінах.

Творы мастацтва, у якіх быў адлюстраваны вобраз Барбары Радзівіл, можна выявіць на працягу прайшоўшых чатырох



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стагоддзяў. У кожным з іх асоба Барбары ўспрыймалася па-свойму, у залежнасці ад светаразумення і сацыякультурных умоў той ці іншай эпохі. Яна сімвалізавала прыгажосць, каханне, шчасце і ў той жа час трагедыю жыцця чалавека. У яе гісторыі імгненнасць жыцця спалучаецца з працягласцю людской памяці. Спробы перадаць ці стварыць вобраз Барбары назіраліся як пры яе жыцці, так і на працягу некалькіх стагоддзяў пасля яе смерці.

У эпоху Адраджэння мастакі нічога не хацелі ведаць і пісаць пра Барбару. Яна не мела прызнання сярод дзеячаў культуры сучаснага ёй пакалення: трактаваць гістарычны і мастацкі вобраз як прыклад для пераймання не ўяўлялася магчымым. Як сведчыцца ў даследаванні З. Куховіча, у 1551 г. узнік толькі ананімны лірычны твор, які можна разглядаць як спробу рэабілітацыі Барбары. Ён называўся «Нараканне каралевы на няшчасце пасля смерці». Засноўваючыся на гістарычных фактах, аўтар стварыў атмасферу смутку, жалю і спачування, разважаючы пра непастаянства чалавечага шчасця і пра непазбежнасць смерці нават моцнага чалавека.

Другі літаратурны твор гэтага часу быў створаны ў 1556 г. Аўтарства яго дакладна не ўстаноўлена. Мяркуюць, што гэтым пісьменнікам мог быць сакратар Барбары Станіслаў Кашыцкі, ці вядомы ў эпоху Адраджэння пісьменнік Мікалай Рэй. Адносіны аўтара да адлюстравання гістарычнага вобраза Барбары пазітыўныя, што сведчыць пра прыбліжанасць аўтара да світы каралевы.

На мяжы XVI — XVII стст. адбываюцца змены ў ацэнцы ролі Барбары Радзівіл. Яе ўсё часцей узгадваюць станоўча, прычынай таму, відаць, была сармацкая ідэалогія, якая складвалася ў гэты час і культывавала традыцыі сям'і, васпяванне магнацкага роду. У пачатку XVII ст. з'яўляюцца лірычныя паэмы ў гонар караля Сігізмунда Аўгуста. Напрыклад, твор Кшыштафа Акунія «Хвала каралю Сігізмунду Аўгусту», у якім з вялікай павагай апісваецца як сам кароль, так і яго жонка, прыгажуня Барбара.

У часы барока ўсе абвінавачванні, якія адносіліся да асобы Барбары, сцерліся і пабляклі. Успаміны пра прыгажосць і вялікае каханне гэтай жанчыны ўсё часцей з'яўляліся ў мастацкіх творах. Сармацкае асяроддзе бачыла ў ёй сімвал польскага адраджэння, што праяўлялася ў негатыўных адносі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных да чужаземцаў, у прыватнасці да італьянцаў, з якімі былі звязаны сямейныя карані Боны Сфорцы. Адзін з творцаў сарматкай ідэалогіі Мацей Стрыйкоўскі пісаў, што адносіны паміж Сігізмундам Аўгустам і Барбарай нагадвалі «пачуццёвую размову»*. Аўтар акцэнтуе варожыя адносіны Боны да сваёй нявесткі і пагаджаецца з версіяй аб атруце Барбары.

Вядомы і жывапісныя партрэты Барбары Радзівіл. Першыя з іх з'явіліся ў XVI ст. Адзін з партрэтаў знаходзіцца ў Кракаўскім музее. Ён выкананы невядомым нямецкім майстрам у 1556 г. У выяве каралевы польскай перадаецца дэкаратыўнасць дарагога адзення, бляск карпатліва напісаных каштоўных камянёў, багатая фактура каралеўскага галаўнога ўбрання. Менавіта гэты партрэт знаходзіцца ў вытоках іканаграфіі шматлікіх партрэтаў Барбары.

Другі варыянт партрэта каралевы быў напісаны ў канцы XVI ст. Ён знаходзіцца ў прыватнай калекцыі ў Варшаве, а копія з яго захоўваецца ў Нясвіжы. Партрэт Барбары Радзівіл таксама напісаў вядомы нямецкі мастак Лукас Кранах, які ў выяве падкрэсліў вялікія, выразныя, але сумныя вочы жанчыны, у чым можна прачытаць спачуванне аўтара да сваёй натуры. У апісаннях знешнасці Барбары абавязкова прыгадваецца прыгажосць яе рук. І Кранах у сваім партрэце падкрэслівае вытанчанасць рук Барбары, якія ўпрыгожаны каштоўнымі пярсцёнкамі.

Самай эстэтычнай выявай каралевы польскай лічыцца партрэт невядомага майстра XVIII ст. На ім вобраз каралевы вельмі лірычны. Кампазіцыю партрэта абрамляе авальная рамка, якая нагадвае аправу, у якой ролю каштоўнай жамчужыны выконвае сама Барбара Радзівіл.

Гісторыя жыцця і множнасць варыянтаў легенд пра Барбару зрабілі яе загадкавай жанчынай, вобраз якой захоўваецца ў народнай памяці шмат стагоддзяў. Загадкай памяці застаецца і яе воблік, які многія даследчыкі пазнаюць у вобразе віленскай Маці Божай Астрабрамскай.

Мастакоў XX ст. таксама вабіць вобраз Барбары Радзівіл. Яе партрэты ў апошняе стагоддзе становяцца больш містычнымі, напоўненымі пераўтварэннямі. Да такіх можна аднесці працы польскіх мастакоў Уладзіслава Мотага, Юліуша Коса-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

* Kuchowicz Zb. Listy miłosne dawnych polakow. Kraków, 1971. 380 s.

ка, Джозафа Сімлера. Сярод беларускіх мастакоў лірычны вобраз, які сімвалізуе жаночую прыгажосць і непаразумелае шчасце кахання, стварылі Аляксей Марачкін і Алег Кашкурэвіч.

Тэатральна-драматычнае мастацтва звярнулася да вобраза Барбары ў перыяд рамантызму, калі праявілася імкненне да нацыянальнай гісторыі, да легендарных асоб, да патрыятычных пачуццяў. У 1817 г. на сцэне Варшаўскага Вялікага тэатра Алаізам Фелінскім, сакратаром Тадэвуша Касцюшкі, быў пастаўлены спектакль «Барбара Радзівіл». У канцы XX ст. у Мінску быў пастаўлены спектакль па паэме Раісы Баравіковай «Барбара Радзівіл». Таксама па п'есе Аляксея Дударава быў пастаўлены спектакль у Нацыянальным беларускім тэатры імя Янкі Купалы, які, на жаль, пазбаўлены ўзвышанасці пачуццяў і канкрэтнасці гістарычных абставін.

Але, нягледзячы на рознасць аўтарскіх трактовак вобраза асобы Барбары Радзівіл, пераважаюць усё ж такі рамантычныя погляды, у якіх польская каралева — сімвал прыгажосці, жаноцкасці і кахання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ